WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 САКАВІКА 2010 г. СЕРАДА № 53 (26661)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І БРАЗІЛІІ ДАЛА МАГЧЫМАСЦЬ ВЫЗНАЧЫЦЬ УЗАЕМАВЫГАДНЫЯ НАПРАМКІ СУПРАЦОЎНІЦТВА



Фота БЕЛТА

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 сакавіка на сустрэчы з Прэзідэнтам Бразіліі Луісам Інасіу Лула да Сілвам.**

Перш за ўсё, гэта сферы, якія садзейнічаюць развіццю буйной сельскагаспадарчай вытворчасці, напрыклад, пастаўкі тэхнікі з усім спадарожным абсталяваннем. Акрамя таго, бразільскі бок цікавіць стварэнне зборачных вытворчасцяў: гэта могуць быць трактары і сельскагаспадарчае абсталяванне. Сур'ёзная цікавасць праяўлена да магчымасці паставак велікагрузнай кар'ернай тэхнікі, самазвалаў БелАЗ. Значныя перспектывы адкрываюцца і ў сферы хімічнай прамысловасці. Беларусь пастаўляе ў Бразілію ў вялікай колькасці шыны, у перспектыве плануецца нарасціць аб'ём гэтых паставак. Бразілія як краіна з развітой сельскай гаспадаркай зацікаўлена ў далейшых пастаўках калійных соляў з Беларусі. Наша краіна ўжо мае трэць бразільскага рынку па пастаўках калійных угнаенняў, і гэта супрацоўніцтва будзе працягнута. Кіраўнікі дзяржаў таксама дамовіліся, што будзе створана двухбаковая гандлёва-эканамічная камісія, якая сваю першую сесію правядзе ў Мінску.

Прэзідэнт Бразіліі вітаў заяву Аляксандра Лукашэнкі аб намеры адкрыць беларускае пасольства ў Бразіліа. Бразілія, кіруючыся прынцыпам узаемнасці, таксама адкрые пасольства ў Мінску.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў удзел Беларусі ў III форуме «Альянс цывілізацый», які пройдзе ў Рыа-дэ-Жанейра ў маі і ўпершыню арганізуецца за межамі Еўрапейска-Міжземнаморскага рэгіёна.

СТАР. 2

Ва Урадзе

## ЭКСПА-2010: БЕЛАРУСЬ ГАТОВАЯ ПРАПАНАВАЦЬ СВЕТУ СВАЕ ДАСЯГНЕННІ

BELARUS EXPO 2010 白俄罗斯

**На ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага абмяркоўвалася пытанне падрыхтоўкі нацыянальнай экспазіцыі Беларусі да Сусветнай выставы «ЭКСПА-2010». Улічваючы, што сёлетняя Шанхайская ЭКСПА задуманая арганізатарамі як найвялікшая ў гісторыі сусветных ЭКСПА, — па тэрыторыі, якую будзе займаць, па колькасці наведвальнікаў і па колькасці ўдзельнікаў, удзел у гэтай падзеі дае нашай краіне шэраг унікальных магчымасцяў. Паводле слоў кіраўніка Урада, гэта ўмацуе імідж Беларусі на міжнароднай арэне, будзе спрыяць рэалізацыі эканамічных, навуковых, культурных інтарэсаў нашай дзяржавы ў свеце і ў цэлым пашырыць супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай.**

СТАР. 2

Гаспадары

## ЛЫЖКАР З ГРЫГАРАЎШЧЫНЫ: «СМАЧНА ЕСЦІ!»



Адразу папярэджваю, што найлепшую драўляную лыжку сёння можна набыць толькі ў Шаркоўшчыне на нядзельным кірмашы ды яшчэ з рук самога майстра. У вас будзе эксклюзіў ручной працы, незаменны ў прыгатаванні розных варэнняў, салатаў, у саленні грыбоў і квашанні капусты... Гаспадыні — умеліцы кухонных спраў — здольныя ацаніць па годнасці гэтую простую рэч, да якой хочацца дакрануцца, адчуць аксамітавую фактуру матэрыялу, пачуць пах натуральнага дрэва. Не, гэта далёка не творы мастацтва, але якая асалода трымаць старажытны традыцыйны посуд, зроблены з паленцаў бярозы альбо вольхі, ліпы ці клёну. Майстар **Валянцін ПІЦЬКО** паспявае за зіму вырабіць сотні лыжак, што не хопіць рук, каб іх абхапіць. Але лыжкі — гэта толькі частка ўмельства майстра.

— Раней вялікім попытам карысталіся маслабойкі, «кадзі»(кадушкі), нават драўляныя вёдры, — узгадвае Валянцін пачатак працы з дрэвам, як да ўсяго ён даходзіў уласным досведам.— Цяпер болей раблю шынкоўкі для капусты, а вось бондарскі посуд значна радзей, бо ўсё меней заказчыкаў.

Менавіта ўласны досвед быў ягоным настаўнікам, хоць нядрэнным бондарам быў дзед, а бацька рубіў хаты, працаваў на лесапілцы. Да працы з дрэвам Валянцін прыйшоў не таму, што гены продкаў паклікалі, а што жыццё гэтак распарадзілася, хлеб надзённы прымусіў.

Скончыўшы васьмігодку, хлопец яшчэ да арміі паспеў папрацаваць у калгасе трактарыстам і вадзіцелем. Потым быў фатографам у раённым Доме быту, бо з дзяцінства меў цягу да фатаграфіі. Здымаў школы, вяселлі, партрэты на дакументы. А ў перабудову, калі зніклі заказы і прафесія бытавога фатографа амаль не карміла, падаўся ў родны калгас, уладкаваўся да бацькі на лесапілку. Даглядаў і калгасны пчальнік з трыццаці вулляў.

— Памятаю час, калі зусім не было грошай, дык на хатніх жорнах малоў зерне на бліны. Самыя розныя заказы выконваў, каб сям'ю ўтрымліваць. Майстэрня мяне выручала. І дагэтуль корміць.

Ён бездакорна асвоіў бондарскую справу, габляваў клёпку для бочак і кадушак і ўжо болей за дзесяць гадоў яго ведаюць як добрага спецыяліста не толькі ў вёсцы Грыгараўшчына, бадай, адзінага і ў сваім, і суседніх раёнах. Нядаўна жыхар Мёрскай вёскі Язна звярнуўся да яго з заказам. Значыць перавяліся на Мёршчыне і бондары, і лыжкары.

За зіму Валянцін Піцько паспеў вырабіць на сваіх самаробных станочках добрую партыю неабходных у сялянскай гаспадарцы тапарышчаў, касавілаў, палюкоў, чаранкоў для рыдлёвак і, вядома ж, лыжак.

— Сотні з дзве, не менш павязу сёлета на кірмаш, — плануе майстар, аглядаючы зробленае ім падчас завей і працяглых маразоў.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Шаркоўшчынскі раён.*

Прамая лінія

## АД ПЕНСІІ ДА ДАПАМОГ

Адрасная сацыяльная дапамога, пенсіі, падтрымка ветэранаў, выплаты да 65-годдзя Перамогі — усё гэта стане тэмамі «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! **Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» пройдзе 5 красавіка з 12 да 13 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### РЭКІ СКІНУЛІ ЛЁД, А НЭПЛІ ПАДТАПІЛА

**У Брэсцкім раёне падтапіла невялікую вёску Нэплі. Яна знаходзіцца недалёка ад дзяржаўнай мяжы, якая праходзіць па Заходнім Бугу. Рака выйшла на пойму, вада пайшла цераз прапускное прыстасаванне ў невялікую рэчку Лясная. Але чатыры трубы прыстасавання не справіліся з напорам, і вада разлілася па ваколіцы.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ**, у Нэплях падтоплена 16 падворкаў і два падвалы. Эвакуацыі насельніцтва не спатрэбілася, а вось аказваць дапамогу вяскоўцам прыбылі многія службы. У іх шэрагу — сем адзінак тэхнікі падраздзяленняў МНС. Узровень вады на падворках дасягаў на працягу дня да 30 сантыметраў. На думку спецыялістаў, адну пажылую жанчыну, чый падворак найбольш пацярпеў і якая мае праблемы са здароўем, лепш за ўсё было б адсяліць. Але пенсіянерка наадрэз адмовілася пакідаць сваю хату. А выратавальнікі і супрацоўнікі іншых службаў прынялі тэрміновыя меры па павелічэнні прапускной здольнасці прыстасавання. Прасцей кажучы, каб дарогай выкапалі траншэю, каб пакласці яшчэ адну трубу, бо чатыры не спраўляюцца. Як толькі вада з Заходняга Буга пайшла ў пяць труб, яе ўзровень у вёсцы стаў прыкметна зніжацца. Растаэмі водамі за суткі ў Брэсцкай вобласці падтапіла шэсць падвалаў жылых дамоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ПАДТАПЛЕННІ Ў БАБРУЙСКУ І КІРАЎСКІМ РАЁНЕ

**У Магілёўскай вобласці 22 сакавіка ўскладнілася паводкавая сітуацыя, паведаміла абласное ўпраўленне МНС.**

Талыя воды трапілі ў прыток ракі Бярэзіны ў Бабруйску, і ў выніку падтапіла 69 дамоў, 72 падворкі і 83 гаспадарчыя пабудовы. Два чалавекі часова перасяліліся ў гасцініцу «Бабруйск». А больш за дзвесце жыхароў адмовіліся ад перасялення і засталіся прыглядаць за сваім дабром.

Падобная сітуацыя здарылася і ў садовым таварыстве «Вялікая Гута» ў Кіраўскім раёне. Там ад талых водаў выйшла з берагоў рака Любонька, таксама прыток Бярэзіны. У вялікім дачным пасёлку падтоплена частка домаўладанняў, якія месцяцца ў нізіне: пацярпелі ад паводкі 53 лецішчы з падворкамі і 95 гаспадарчых пабудоў.

**Ілона ІВАНОВА.**



Фота БЕЛТА

Некалькі прыватных падворкаў падтоплена талымі водамі ў Заслаўі на вуліцы Дачнай, Першамайскай і Дачным завулку. Як расказалі мясцовыя жыхары, падтапленне адбылося 22 сакавіка раніцай. К вечару таго ж дня вада спала. Тым не менш падвалы на некаторых участках затоплены.

### СІТУАЦЫЯ ПАД КАНТРОЛЕМ

**За апошнія суткі, паводле інфармацыі прэс-службы Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, у рэгіёне былі падтопленыя тры жылыя дамы, сем склепаў, адна гаспадарчая пабудова і шэсць іншых будынкаў у Астравецкім, Воранаўскім, Карэліцкім, Навагрудскім, Смаргонскім і Шчучынскім раёнах. Сітуацыя пад кантролем.**

Катастрафічных наступстваў нідзе не было, падтапленні ліквідавалі ў той жа дзень. Толькі ў Воранаўскім раёне спатрэбілася дапамога супрацоўнікаў МНС, а ў астатніх выпадках праблему вырашылі сіламі тутэйшых сельгаспрадпрыемстваў і ведамстваў.

Дарэчы, у Навагрудскім раёне папрацавалі спецыялісты Пінскага цэнтра рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС. Каб прадухіліць шкоду мастам, яны правялі падрыў лёду на Нёмане ў раёне вёсак Дзяляцічы, Гнесічы, Лазкі і Панямунь.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### СНЕГ РАСТАЎ ЗА ДВА ДНІ

— Сёлета будзе вялікая вада. Але ж не чакаецца ВЕЛЬМІ вялікай вады, — кіраўнік групы метэаназіранняў Гомельскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя Ала Аўчыннікава лічыць, што няма падстаў для панікі вакол сітуацыі з магчымай паводкай.

— Чакаецца, што вада пойдзе да нас з Расіі — у іх да гэтага часу снег ідзе. І тым не менш, не чакаецца, як некаторыя пужаюць, што мы тут усе будзем плаваць. За суткі на Дняпры каля Жлобіна вада паднялася на 30 сантыметраў. Гэта вельмі хутка. Звычайна ў паводку вада паднімаецца на 5 сантыметраў за суткі. Толькі на Прыпяці каля Чэрнічаў вада набліжаецца да небяспечнага ўзроўню. На Сажы каля Гомеля зараз 277 сантыметраў, а небяспечны ўзровень складае 560, да яго яшчэ амаль тры метры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Прамая лінія Дзяржкантролю

## «КАТЭТАР НЕ МЯНЯЮЦЬ... СЕНА НЕ ДАЮЦЬ...»

**У Віцебску на тэлефонную сувязь з жыхарамі вобласці выйшаў кіраўнік Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон ЛОМАЦЬ. За тры гадзіны паспеў пагаварыць больш чым з 40 чалавекамі. Сувязісты зафіксавалі 18 тысяч спробаў дазваніцца.**

Галоўны кантралёр Беларусі адразу ставіў задачы перад чыноўнікамі, якіх запрасілі на прамую лінію, каб, калі можна, аператыўна пастараліся вырашыць праблемы. Вядома, некаторыя выказаныя праблемныя пытанні патрабуюць часу для вывучэння і прыняцця канкрэтных рашэнняў па іх.

А некаторым грамадзянам адразу прыйшлося адмовіць у вырашэнні іх пытанняў. У прыватнасці, як можна дапамагчы чалавеку атрымаць бясплатнае жыллё, калі ён не мае на гэта правоў? Ці кампенсаваць банкаўскі ўклад савецкага часу, калі няма для гэтага ніякіх адпаведных пастаноў?

Не мог пакінуць без непрыемных эмоцый званок ад пенсіянеркі з Полацкага раёна. Яна расказала, што да яе мужа, ветэрана вайны, не прыходзяць медыкі. «А яму ж катэтар паставілі, — скардзіцца бабуля. — І не мяняюць месяцамі. Наогул успамінаюць пра мужа толькі, калі святкуецца Перамога. У вёсцы не працуе ўрачэбная амбулаторыя».

Пачуўшы гэта, Зянон Ломаць не хаваў эмоцый. «Чым займаюцца галоўны ўрач, работнікі сацыяльнай службы раёна? Я лічу, што павінна быць дадзена жорсткая ацэнка іх работы — нават да звальнення адказных асобаў за такія бяздушныя адносіны», — звярнуўся ён да адказных асобаў, прысутных у зале.

Ужо пасля прамой лініі кіраўнік упраўлення аховы здароўя аблвыканкама растлумачыў, што медыкі адразу, падчас прамой лініі прыехалі ў гэты дом і ўжо аказалі дапамогу. Нельга сказаць, што насамрэч медыкі забывалі ветэрана. Наведвалі ветэрана, але не так часта, як можна было б. І надалей «па графіку» будуць наведваць старога. Ломаць даручыў чыноўнікам даследаваць і ўмовы жылля ветэрана і жонкі. Мо рамонт патрэбны? Мо тэлевізар ім новы падарыць трэба? І паабяцаў расказаць пра жахлівы выпадак губернатару Косінцу.

Сярод іншых патурбавала Зянона Ломаця жыхарка Віцебскага раёна, якая паскардзілася на тое, што яе муж, кіроўца ў сельскагаспадарчым таварыстве, адпрацаваў удвая больш, чым звычайна, а грошай за перапрацоўку не атрымаў.

Не магла пакінуць абыякавым просьба з глыбінкі — з Шумілінскага раёна — дапамагчы з... сенам. Папрасіла пра гэта жанчына, якая трымае дзвюх кароў, цяля. Малака здае 9 тон у год. Нямала! А паразуменне ў тым, што тым жа сенам можна было б дапамагчы, нідзе не знаходзіць. Яна гадуе дзіця, даглядае старую маму.

— Чаму не дапаможа старшыня райвыканкама? — абурыўся Зянон Ломаць. — А старшыня сельскага Савета? Такіх людзей, як гэтая жанчына, трэба падтрымліваць. І розную дапамогу аказваць.

Пасля «прамой лініі» Зянон Ломаць падзяліўся з журналістамі ўражаннямі.

— Людзі, якія тэлефанавалі, былі ў асноўным добразычлівымі. І не абыякавымі. Іх турбуюць не толькі асабістыя праблемы, але і рэгіёна. Вельмі шмат было цікавых прапаноў. Напрыклад, з Дзісны мужчына паведаміў, што збудаванні гадамі не выкарыстоўваюцца. А там жа можна адкрыць новыя вытворчасці або нешта яшчэ карыснае. Разбярэмся, — гаворыць Зянон Ломаць. — Жыхары Віцебска выступілі з самымі рознымі прапановамі. Шэраг званкоў тычыўся няякаснага будаўніцтва жылля: здалі дом летась, а дах ужо цячэ. У аграгарадках жыллё новае не без праблем у сэнсе якасці. На Віцебшчыне наогул, у параўнанні з іншымі абласцямі, ЖКГ на самым нізкім узроўні. Вельмі шмат праблем накапілася за гады. І вырашаць іх трэба актыўна. Хвалююць людзей высокія цэны на лекі ў дзяржаўных аптэках. Паглядзім. На гандаль людзі не скардзіліся. Пры гэтым грамадзяне расказвалі, дзе можна было б адкрыць крамы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Дзіцячы садок — у палоне сальманэлёзу

**Успышка вострай кішэчнай інфекцыі адбылася ў дзіцячым садку № 29 Пінска. Згодна з інфармацыяй прэс-службы Міністэрства аховы здароўя, за перыяд з 20 па 22 сакавіка на кішэчную інфекцыю захварэлі 91 выхаванец дзіцячага садка і 3 работнікі дашкольнай установы. Цяжкіх формаў захворвання зарэгістравана не было.**

Дзеля аператыўнага маніторынгу за эпідэмічнай сітуацыяй і каардынацыі дзейнасці па лакалізацыі ачага ўспышкі ў Пінску быў створаны аператыўны штаб пад кіраўніцтвам старшыні гарвыканкама. Пасяджэнні штаба праводзяцца двойчы на дзень з прыцягненнем усіх зацікаўленых асобаў. Урачамі з выездам на дом быў праведзены агляд усіх дзяцей, якія наведвалі дзіцячы садок. Своечасова на даму былі выяўлены 32 захварэлыя з агульнай колькасці шпіталізаваных дзяцей. Пракуратура Пінска ўзбудзіла крымінальную справу па ч.1 арт. 336 Крымінальнага кодэкса Беларусі (парушэнне санітарна-эпідэміялагічных правілаў).

А ўчора намеснік галоўнага ўрача Брэсцкай вобласці Алег Арнаутаў агучыў прычыну групавой захваральнасці вострай кішэчнай інфекцыяй у дзіцячым садзе — як было ўстаноўлена, яго выхаванцы і работнікі дашкольнай установы сталі ахвярай сальманэлёзу. У Брэсцкім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя карэспандэнту «Звязды» ўдакладнілі: сальманэла была выдзелена ў захварэлых дзяцей, аднак якія прадукты былі заражаныя сальманэлай, пакуль невядома. Вынікі лабараторных даследаванняў будуць вядомыя праз некалькі дзён.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### БЕЛАРУС УЦЁК З «БУТЫРКІ»

**Грамадзянін нашай краіны, які абвінавачваецца ў крадзяжах на тэрыторыі Беларусі і ў расійскай сталіцы і які знаходзіўся ў міжнародным вышуку, у панядзелак умудрыўся знікнуць са следчага ізалятара Масквы «Бутырская турма».**

26-гадовы Віталь Астроўскі прэтэндуе на «лаўры» знакамітасці, бо за апошнія дзесяць гадоў з вядомай «Бутыркі» ўдалося хітрасцю вырвацца на свабоду лічаным арыштантам. Беларус, затрыманы ў снежні мінулага года, уцёк у той момант, калі яго вялі ў лазню: адпіхнуўшы супрацоўніка следчага ізалятара, ён выбег ва ўнутраны двор ізалятара, пераадолеў агароджу з арміраванага калючага дроту і знік. Дарэчы, на пачатку сакавіка Віталь Астроўскі спрабаваў у следчым ізалятары звесці рахункі з жыццём, пасля чаго быў пераведзены ў псіхіятрычную бальніцу ізалятара «Бутырская турма». Цяпер зніклага без вопраткі падследнага беларуса расшукваюць.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Рэха публікацыі

## СА 110-ГАДОВАГА ДОМА — У НОВЫ

**Пасля публікацыі ў «Звяздзе» артыкула «Дому 110 гадоў. Жыць нельга...» названы матэрыял адправілі на рэагаванне. Жыллёвае пытанне галоўнай гераіні артыкула — інваліда другой групы, якая прапісана ў аварыйным доме без перспектывы неяк паправіць жыллёвае становішча пачало вырашацца. Аўтара артыкула, карэспандэнта «Звязды», выклікалі ў Віцебскі гарвыканкам, каб ён змог упэўніцца ў гэтым.**

Добра, што адказныя асобы Віцебскага гарвыканкама пастараліся з разуменнем паставіцца да праблемнага артыкула. Урэшце разабрацца больш пільна. Першы намеснік старшыні гарвыканкама па пытаннях будаўніцтва Уладзімір Сяргеевіч Каташук распарадзіўся, каб па гераіню артыкула адправілі службовую машыну.

Не буду перадаваць усе падрабязнасці гэтай нялёгкай сустрэчы. Пра тое, ці насамрэч можна жыць у такім паўразбураным доме, дзе жыве, пра нюансы разгляду чарговага звароту па вырашэнні жыллёвага пытання. Пра тое, чаму пісьмова не адказалі наконт аднаго хвалюючага пытання...

Галоўнае, што прама падчас сустрэчы гэтае самае жыллёвае пытанне пачало вырашацца. Як адзначыў першы намеснік старшыні гарвыканкама Уладзімір Каташук, уладальніку дома, які жыве ў Маскве, адпраўлены афіцыйны ліст. У лісце гэтым гаворыцца, што аварыйны дом павінен быць або капітальна адрамантаваны, або самастойна разбураны. Нагадаю, што ў гэтым доме прапісаны Ірына Алісейка і яе сын, а не яго ўладальнікі, з-за гэтага і не было ў свой час магчымасці палепшыць ім жыллёвыя ўмовы.

А ўладальнік дома, сын яе цёткі, паводле слоў Ірыны, не збіраецца неяк наводзіць парадак у доме № 9 на вуліцы Віцебскай, пра што ёй і паведаміў. І наўрад ці цяпер захоча раптам траціць вялікія грошы на фактычна поўны рамонт дома, які прызнаны аварыйным і непрыдатным для жыцця.

— Такіх збудаванняў у горадзе быць, безумоўна, не павінна. Уласнік абавязаны клапаціцца пра сваю маёмасць. Адпаведна неабходна зрабіць рэвізію такога жылля на тэрыторыі ўсяго раёна, каб абавязаць уладальнікаў незалежна ад таго, дзе яны знаходзяцца, паклапаціцца пра такія ж дамы, якім патрэбны капітальны рамонт. Не будзе рэакцыі з боку ўладальніка? Ёсць што рабіць і ў такім выпадку, — кажа **першы намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Уладзімір КАТАШУК.** — А калі нешта здарыцца? Траўму нехта атрымае. Потым вінаватых прыйдзецца шукаць? Прапануем уладальніку знесці дом, напрыклад, за тры месяцы. Дом у выпадку таго, калі адмовіцца разбураць уладальнік, разбураць за гарадскія грошы, з далейшай кампенсацыяй выдаткаў пасля разгляду спрэчнай справы ў судовым парадку. Паколькі Ірына Алісейка і яе сын стаяць удваіх на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў, прапаноўваецца будаўніцтва новага жылля — з самага таннага жылля, у дамах буйнапанэльнага домазбудавання. Прапрацаваны ўсе пытанні...

— У мяне цяжкае становішча! — адказвае Ірына.

Высветлілася, што раней ёй субсідыю не прапаноўвалі. І кошт жылля, якое прапанавалі будаваць, здаваўся ёй, як яна адзначыла, шалёным.

Ірына папрасіла прысутных адказных асобаў даць магчымасць пабудаваць аднапакаёвую кватэру. Пайшлі насустрач. На імя Ірыны будзе налічана субсідыя, яшчэ яна атрымае льготны крэдыт...

Была напісана ў службовым кабінеце адпаведная заява. Кватэра новая будзе заселена. Дом, якому 110 гадоў, будзе разбураны. На працягу трох месяцаў прапаноўваецца маскоўскаму ўладальніку дома разбурыць яго. Калі не пагадзіцца і не даверыць гэта зрабіць гарадскім уладам, разбяруць дом за дзяржаўны кошт з наступным патрабаваннем кампенсацыі выдаткаў. Праблему старога дома гарадскія ўлады стараюцца вырашаць комплексна.

Насамрэч прыемна, калі «Звязда» неяк паўплывала на станоўчае вырашэнне праблемы. Калі іншым чытачам ёсць чым праблемным падзяліцца, калі ласка. На жаль, добрымі навінамі чытачы дзеляцца рэдка. А чаму б і не? Добрых навінаў таксама хацелася б ад чытацкай аўдыторыі. Упэўнены, што адпаведную рубрыку «Што ў вас добрага?» трэба аднавіць. Бясспрэчна!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### НЕ ЎТРЫМАЎСЯ

Брыгадзір сельгаспрадпрыемства Столінскага раёна ўжо быў асуджаны за крадзеж грамадскай маёмасці. Але не вытрымаў спакусы зноў. Бо калі павёў здаваць жывёлу на мясакамбінат, прыхапіў сабе 1 800 000 рублёў.

**Яна СВЕТАВА.**

Выстава

## БЕЛАРУСКІ БУДАЎНІЧЫ РЫНАК: ЁСЦЬ ШТО ПАКАЗАЦЬ І ПРАПАНАВАЦЬ!

**Учора ў сталіцы распачала сваю працу 13-я міжнародная спецыялізаваная выстава «Будэкспа-2010. Беларускі будаўнічы рынак прапануе». Яе праводзіць Нацыянальны выставачны цэнтр «Белэкспа», Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры садзейнічанні Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства прамысловасці, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і Мінгарвыканкама. Адносна прадстаўніцтва такога форуму некалькі штрыхоў можа дадаць выніковая інфармацыя па леташняй выставе: удзел у ёй бралі 370 фірмаў і арганізацый з 15 краін свету, экспазіцыі наведалі каля 18 тысяч спецыялістаў. Так, мэта форуму — заключэнне дагавораў у галіне будматэрыялаў і будаўнічых паслуг у краіне. Тэматыка выставы цалкам адпавядае заяўленым задачам і ахоплівае ўвесь спектр вышэйназваных матэрыялаў і паслуг, якія дазваляюць рабіць наша жытло, месцы працы, а ў больш шырокім сэнсе — само жыццё па-сучаснаму камфортнымі, адпаведнымі найноўшым тэхналогіям у гэтай галіне.**

СТАР. 2



Гродзенская «Цытадэль» здзівіла каванай альтанкай з барбекю.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

Матэрыялы і паслугі — на любы густ



| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.03.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 981,00 | 1 чэшская крона | 158,69 |
| ▲ 1 еўра | 4 032,10 | 1 польскі злоты | 1 035,25 |
| 1 латвійскі лат | 5 693,82 | ▼ 1 расійскі рубель | 101,15 |
| 1 літоўскі літ | 1 168,20 | 1 украінская грыўня | 375,68 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 29,4707 |
| 10 UAH | 37,0934 |
| 1000 BYR | 9,8995 |
| EUR | 39,8238 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

Падрабязнасці

# ПЛЮСЫ І МІНУСЫ ВЯЛІКАЙ ВАДЫ

## ЧАГО ЧАКАЦЬ АД БУДАЎНІЦТВА НЯМНОЎСКАЙ ГЭС?

**У РУП «Гроднаэнерга» адбылося абмеркаванне з насельніцтвам горада пытанняў будаўніцтва і ўплыву на навакольнае асяроддзе Нямноўскай ГЭС. Нягледзячы на анонсы грамадскіх слуханняў у мясцовых СМІ, ахвотных разабрацца ў тых ці іншых аспектах, звязаных з размяшчэннем на Нёмане новай гідраэлектрастанцыі, аказалася няшмат. У зале пераважалі спецыялісты і журналісты, якія прыйшлі па сваім службовым абавязку. Што расчаравала аднаго з арганізатараў грамадскіх слуханняў, начальніка службы перспектыўнага развіцця РУП «Гроднаэнерга» Віктара Мікуліча. Асабліва на фоне вялікай цікавасці, праяўленай, паводле яго слоў, насельніцтвам у Зэльве падчас нядаўняга абмеркавання пытанняў будаўніцтва вугальнай электрастанцыі.**

Зрэшты, не ўсё вымяраецца колькасцю ўдзельнікаў мерапрыемства. Нешматлікія гараджане, якія прадстаўлялі на слуханнях у «Гроднаэнерга» грамадскасць, праявілі сябе людзьмі зацікаўленымі, неабыякавымі, якія хварэлі не толькі за свае асабістыя інтарэсы, але і за будучыню рэгіёна. А спецыялісты, якія адказвалі на пытанні, ніводнага разу не сказалі, што тыя ці іншыя факты, маўляў, не для шырокай аўдыторыі.

Вось толькі некаторыя ключавыя моманты.

### Зусім не новая ідэя

Яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя быў праект будаўніцтва сямі гідраэлектрастанцый на Нёмане, аднак з распадам СССР гэта тэма была «на паліцы», і вось цяпер яна вяртаецца на парадак дня суверэннай краіны Беларусь. Гэта тлумачыцца неабходнасцю зменшыць залежнасць ад закупак традыцыйных відаў паліва ў Расіі за кошт мясцовых рэсурсаў і, у прыватнасці, развіцця гідраэнергетыкі. Тым больш што на цяперашні час у краіне выкарыстоўваецца ўсяго некалькі працэнтаў ад агульнага аб'ёму прыдатных для гэтага водных рэсурсаў.

Адной з першых «ластавак» у гэтым кірунку стала Гродзенская ГЭС магутнасцю 17 мегават вышэй па цячэнні Нёмана ў раёне вёскі Шчачынава, якая цяпер будуецца і павінна быць уведзена ў эксплуатацыю ў 2011 годзе. А наступны крок — Нямноўская ГЭС з устаноўленай магутнасцю каля 22 мегават і максімальным перападам паміж верхнім і ніжнім узроўнямі плаціны 9 метраў. Мяркуецца, што ў сярэдні па воднасці год яна будзе выпрацоўваць 113 млн кВт. г. электраэнергіі. Кошт будаўніцтва — 110—120 мільёнаў долараў.

Ацэнка ўздзеяння на навакольнае асяроддзе Нямноўскай ГЭС (з адпаведнымі высновамі можна азнаёміцца на сайтах www.minpriroda.by і www.ohrana.prirody.grodno.by) праводзілася Цэнтральным НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў з удзелам інстытутаў гісторыі і эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах. З трох варыянтаў размяшчэння плаціны ГЭС прыярытэтным вызначана месца за дваццаць кіламетраў ніжэй Гродна каля вёскі Плябанскія. Асноўны аргумент — найменшая плошча затаплення (максімум можа скласці каля 600 гектараў), што істотна скарачае затраты на кампенсацыйныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы вадасховішча. Акрамя таго, пры гэтым варыянце забяспечваецца магчымасць суднаходства па Нёмане шляхам будаўніцтва шлюза ў створы гідраэлектрастанцыі альбо за кошт злучальнай «артэрыі» ад Аўгустоўскага канала да вадасховішча ГЭС з выкарыстаннем існуючага шлюза «Нямнова».

Паводле ацэнак спецыялістаў Цэнтральнага НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, у выніку размяшчэння Нямноўскай ГЭС якасць вады ў Нёмане не пагоршыцца. А ў выпадку надзвычайнай сітуацыі, прарыву плаціны хваля не акажа значнага негатыўнага ўплыву на навакольнае асяроддзе і аб'екты. У тым ліку і ў трансгранічным аспекце, для нашых суседзяў — літоўцаў. Дарэчы, нашы спецыялісты, згодна з інфармацыяй Віктара Мікуліча, ужо выязджалі ў Літву і сустракаліся з мясцовым насельніцтвам і ўладамі па пытаннях будаўніцтва Нямноўскай ГЭС. Даследаванні паказалі, што па асноўных кампанентах навакольнага асяроддзя трансгранічнае ўздзеянне на тэрыторыю Літоўскай Рэспублікі адсутнічае альбо будзе нязначным. З літоўскім бокам будаўніцтва станцыі ўзгоднена.

А наколькі «ўзгоднены» гэтыя праект з прыродай, прадстаўнікамі флоры і фауны?

### Некаторыя расліны перасадзяць, а шкоды рыбным запасам не пазбегнуць

У непасрэднай блізкасці ад будучай плаціны ГЭС размешчаны рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Гродзенская пушча». Там выяўлена каля тысячы відаў сасудзістых раслін, 26 з якіх уключана ў Чырвоную кнігу Беларусі, напрыклад, гарачаўка крыжападобная, шпажнік чарапічны, пустарэбернік Фішара. Каб не страціць папуляцыю гэтых «насельнікаў» на берагах Нёмана, прадугледжаны мерапрыемствы па іх перасадцы.

Што, на жаль, немагчыма зрабіць у дачыненні да асабліва каштоўных лясоў (на плошчы 24,3 гектара), якія цалкам знікнуць пры стварэнні вадасховішча. Да таго ж, пры ўзвышэнні ўзроўню вады ў Нёмане будуць затопленыя нізоўі многіх малых рэчак і ручаёў, якія характарызуюцца ключавой падзарадкай і да сёння застаюцца ў натуральным стане з рэдкімі відамі водных і каляводных раслін — вераніка ключавая, залозніца крылатая, паручайніца водная, шаўкоўнік ілжэплаваючы.

А вось праблем для птушак (зону ўплыву ГЭС насяляюць 10 відаў — «чырванакніжнікаў»: вялікі крахаль, чорны бусел, вялікая белая чапля, арлан-белахвост, чырвоны каршун, трохпальцы дзяцел і іншыя) не прагназуецца. Наадварот, для большасці з іх умовы пражывання як у гнездавы перыяд, так і на зімоўцы пасля стварэння вадасховішча палепшацца. Паводле ацэнкі ўплыву ГЭС на біяразнастайнасць, няма чаго «хваляваць» і такім ахоўным відам насякомых, як жужаль рашэцісты, гнаявік вясновы, чмель Шрэнка, жужаль фіялетавы, страказа імператар-дазоршчык.

Куды больш праблематычная сітуацыя будзе для рыбы, якой на ўчастку ракі ў зоне размяшчэння Нямноўскай ГЭС на сёння 27 відаў. Негатыўны ўплыў размяшчэння гідраэлектрастанцыі, звязаны з істотным змяншэннем хуткасці цячэння вады ў верхнім узроўні плаціны, адаб'ецца ў асноўным на рэафільных відах (быстранка, жэрах, галавень, вусач, рыбец (сырць), падуст, ялец, галец). Яны нерасцяцца на хуткатоках, перакатах і таму будуць перамяшчацца ў вярхоўе вадасховішча, дзе захаваюцца прыдатныя для іх умовы. Альбо зусім пакінуць зону падпору вадасховішча. Горш стане і тым відам рыбаў, што адкладваюць ікру на камяністы ці пясчана-гравійны субстрат.

Агульная ацэнка рыбагаспадарчых стратаў у ходзе будаўніцтва Нёманскай ГЭС (шкода, звязаная з гібеллю рыбы, зніжэннем прадукцыйнасці шэрагу папуляцый у выніку страты альбо пагаршэння ўмоваў для жыцця і размнажэння) складае прыкладна 1,2 мільярда рублёў.

Дарэчы, у выніку будаўніцтва плаціны Каўнаскай ГЭС прахадныя віды рыбы ў Нёман на тэрыторыі Беларусі практычна не трапляюць. Аднак цяпер не выключана, што літоўцы пабудуюць рыбаход і тады адпаведныя збудаванні могуць з'явіцца і ў створы плаціны Нямноўскай ГЭС.

Зрэшты, будаўніцтва гідраэлектрастанцыі самым непасрэдным чынам закране інтарэсы не толькі прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага свету на гэтай тэрыторыі, але і людзей.

### Не абараніць, а перасяліць?

У зону затаплення пры будаўніцтве Нямноўскай ГЭС трапляюць 42 жылыя дамы, 20 гаспадарчых пабудоў і шэраг садовых участкаў. І самае праблемнае месца — каля вёскі Кукалі. Як прагучала на грамадскіх слуханнях у РУП «Гроднаэнерга», будаўніцтва там польдараў па абароне ад вялікай вады малаверагоднае, паколькі будзе каштаваць не менш за сем мільёнаў долараў. Таму, хутчэй за ўсё, камісія будзе ацэньваць кошт дамоў і гаспадарчых пабудоў з кампенсацыяй затрат па іх пераносе ў іншае месца. Альбо, дакладней, па будаўніцтве ў іншым месцы, бо не ўсё можна перанесці. Зрэшты, гэты варыянт, які разоў у дзесяць таннейшы за будаўніцтва польдараў, яшчэ не канчатковы. Паводле слоў начальніка службы перспектыўнага развіцця РУП «Гроднаэнерга» Віктара Мікуліча, «пытанне, як быць з гэтымі дачнымі ўчасткамі, будзе вырашацца на высокім узроўні». Пры гэтым нельга не падтрымаць яго пазіцыю, што ўсё павінна быць «зроблена па-людску».

Праўда, падчас грамадскіх слуханняў насцярожыла выказванне, што, маўляў, «частка дачных участкаў не ўзаконена і ўжо не можа быць узаконена», бо ў такім разе можна наогул застацца без нейкіх кампенсацыйных выплат. У адказ на гэта старшыня садоўніцкага таварыства «Кукалі» зазначыла, што «ў кожнага ўсё ўзаконена ад пачатку да канца, усе маюць дакументы».

Відавочна, што гэта праблема патрабуе дэталёвага аналізу і абмеркавання з усімі членамі садоўніцкага таварыства, каб людзі ў выніку будаўніцтва ГЭС не аказаліся са стратамі.

Вось такія плюсы і мінусы вялікай вады Нёмана. Што пераважыць? Канчатковае рашэнне — за Урадам.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Ну і ну!

### ДЫЗПАЛІВА КРАЎ... ВАРТАЎНІК

**У пачатку сакавіка са складскога памяшкання ў вёсцы Пескі Шчучынскага раёна была ўкрадзена вялікая колькасць дызельнага паліва. Пад падазрэнне трапіў 20-гадовы вартаўнік гэтага сельгаскааператыва, які дзяжурыў у тую ноч. Дарэчы, на працы ў гаспадарцы ён адбываў пакаранне за крадзеж.**

Паводле інфармацыі начальніка аддзела крымінальнага вышуку Шчучынскага РАУС маёра міліцыі Андрэя Якусіка, усё пачалося з крадзяжу дваццаці літраў саляркі, якімі малады чалавек запраўіў аўтамабіль свайго знаёмага. І, як кажуць, пайшло-паехала, узамен на грошы і розныя паслугі. Уначы вартаўнік сам узламаў дзверы ў складское памяшканне і з дапамогай помпы стаў адпампоўваць дызпаліва ў тару саўдзельніка злачынства.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ЗНІКЛА КАСМЕТЫКА: 160 КІЛО!

**З прыпаркаванай машыны нехта ўмудрыўся выкрасці 49 скрынь тушы для веек**

**Замежнае прадпрыемства, якое займаецца продажам касметыкі, атрымала чарговую партыю тавару: апошні быў загружаны ў машыну, якую пакінулі на час на вуліцы Бабушкіна ля дома 39 у Мінску.**

Як распавёў карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр Кастрычніцкага РУУС Сяргей Чабатароў, работнікі прадпрыемства прыйшлі за касметыкай праз суткі, аднак былі непрыемна ўражаныя, бо ўвесь груз знік. Камусьці ўдалося, не выклікаючы падазрэння, украсці тавару на агульную суму больш за 81 мільён рублёў. Праваахоўнікі цяпер займаюцца пошукам аматара прыгажосці.

**Ігар ГРЫШЫН.**

У **суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **КУХЕЛЬНАГА Юрыя Іванавіча**, 21 лістапада 1953 года нараджэння, ураджэнца г. Кіева, Украіна, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Кобрын, вул. Свярдлова, д. 39.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб месцы знаходжання Кухельнага Ю.І., паведаміць іх суду Кобрынскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У **суд Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні адсутным без вестак грамадзяніна **СІНКЕВІЧА Эдуарда Уладзіміравіча**, 07.02.1968 года нараджэння, ураджэнца в. Жарскія Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Апошняе вядомае месца жыхарства — г.п. Лынтупы, вул. Галубкова, 89 Віцебскай вобласці.

У сувязі з гэтым просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Сінкевіча Эдуарда Уладзіміравіча, паведаміць іх суду Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання аб'явы.

### ПАЖАР У КАВЯРНІ

У брэсцкай кавярні «Усход» раптам паваліў дым з харчовага блока. Па выкліку на пажар прыехала шэсць адзінак тэхнікі. Выратавальнікі хутка эвакуявалі наведвальнікаў — 50 чалавек. Агонь патушылі за хвіліны, ліквідавалі задымленне. Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС, узгаранне пачалося ад пакінутай без увагі фрыцюрніцы. Ніхто з персаналу, а таксама з гасцей не пацярпеў.

**Яна СВЕТАВА.**

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

## Открытое акционерное общество «МинскСортСемОвощ»

*Адрес: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1*

**Основные виды деятельности: оптовая и розничная торговля**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 года

млн руб.

| Наименование показателя | Код строки | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| **АКТИВ** | | |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Основные средства | 110 | 4563 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | - |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 4566 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Запасы и затраты | 210 | 8837 |
| в т.ч. сырье, материалы и др. активы | 211 | 649 |
| расходы на реализацию | 214 | 134 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 6608 |
| товары отгруженные | 216 | 1238 |
| расходы будущих периодов | 218 | 208 |
| Налоги по приобретенным ценностям | 220 | 217 |
| Дебиторская задолженность | 240 | 2029 |
| Денежные средства | 260 | 339 |
| Финансовые вложения | 270 | 12 |
| Прочие оборотные активы | 280 | - |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 11434 |
| **БАЛАНС** | | **16000** |
| **ПАССИВ** | | |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | |
| Уставный фонд | 410 | 214 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - |
| Резервный фонд | 420 | 260 |
| Добавочный фонд | 430 | 5929 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - |
| Нераспределенная прибыль | 450 | 5930 |
| Целевое финансирование | 460 | - |
| Доходы буд. периодов | 470 | 1778 |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 14111 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - |
| Кредиторская задолженность | 620 | 1886 |
| Задолженность перед учредителями | 630 | 3 |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - |
| Прочие виды обязательств | 650 | - |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 1889 |
| **БАЛАНС** | | **16000** |

**Количество акционеров всего — 1106, в т.ч. юридических лиц — 1.**
**Направлено прибыли за 2009 год на выплату дивидендов 400,1 млн рублей.**
**Среднесписочная численность работающих — 165 чел.**

Данные отчета подтверждены Управлением ведомственного контроля Министерства сельского хозяйства и продовольствия РБ.

**Руководитель: Черняк Анатолий Иосифович**

**Гл. бухгалтер: Островская Людмила Николаевна** УНН 600052664

В извещении о проведении 31 марта 2010 года 97-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 18 марта 2010 г.):

- перед строкой 39 (лот № 39) вместо «ОАО «Строительный трест № 4» тел. 203 13 73» **читать «ОАО «Строительный трест № 4» тел. 280 26 96»;**
- в строке 80, лот № 80 вместо: «ул. Карастояновой, 18, часть помещения в диспетчерской станции «Славинского», ...» **следует читать: «ул. Карастояновой, 45, часть помещения в диспетчерской станции «Карастояновой», ...».**

**Телефон для справок 227 40 22.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Здание столярного цеха и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Продавец недвижимого имущества | Республиканское унитарное производственное предприятие «Гранит» тел. (01645) 4 34 89, факс (01645) 4 36 00 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Лунинецкий район, г. Микашевичи, ул. Маяковского, 37 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание столярного цеха, 1-этажн., 1990 г.п., общая площадь – 99,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,0255 га, срок аренды – 49 лет, ограничения в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, использовать земельный участок для размещения производства, общественного питания, торговли, услуг |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | **9017930** |
| Сумма задатка, руб. | **901790** |
| Организатор аукциона | ***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 21 19 82; 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, 23 44 78, www.brest-region.by*** |

Аукцион состоится **27 апреля 2010 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе предоставляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005, Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538. Срок внесения – 26.04.2010 г. включительно.
3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.
4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
У пачатку сваёй справаздачы Генадзь Нявыглас засяродзіўся на станоўчых момантах. У прыватнасці, узгадаў выступленне ў адборачным цыкле-2010 нацыянальнай каманды. І хоць, паводле слоў старшыні федэрацыі, трэнерскі штаб ацэнены «жорстка і крытычна», федэрацыя выказала яму давер і на наступную кваліфікацыю. У якасці асноўных дасягненняў беларускага футбола Генадзь Нявыглас узгадаў поспехі моладзевай зборнай і нацыянальнай каманды па міні-футболе — фіналістак чэмпіянату Еўропы, а таксама футбольны клуб БАТЭ. Станоўча былі ацэненыя УЕФА намаганні беларускай федэрацыі футбола ў частцы правядзення трэнерскіх семінараў і сімпозіумаў, у выніку Беларусі даверылі правесці выканкам УЕФА ў кастрычніку гэтага года.

Другую частку справаздачы старшыні федэрацыі занялі праблемныя моманты беларускага футбола. У прыватнасці, адсутнасць на стадыёнах падагрэву палёў і асвятлення. У краіне толькі 6 палёў маюць падагрэў і 9 стадыёнаў — асвятленне. «Сістэмай падагрэву не абсталяваны нават поле футбольнага клуба БАТЭ, а стадыён, дзе гуляе «Нафтан», не мае ні падагрэву, ні асвятлення», — пакрытыкаваў неаператыўнае развіццё інфраструктуры клубаў Генадзь Нявыглас. Год таму, дарэчы, на аналагічнай канферэнцыі размова ішла пра тое ж, праўда, не змянілася літаральна нічога. Далей Генадзь Нявыглас узгадаў, што футбольным клубам вышэйшай лігі аказваецца дзяржпадтрымка. І згодна з адпаведным указам, 20 % ад яе клубы павінны расходаваць на развіццё інфраструктуры, 10 % укладваць у дзіцячы футбол. У сапраўднасці атрымліваецца, што сродкі ідуць на зарплату і зборы. «Футбольны клуб «Граніт» патраціў вялізныя сродкі на каманду, у выніку вылецеў з вышэйшай лігі, не пакінуўшы пасля сябе нічога», — прывёў прыклад кіраўнік беларускага футбола. І нагадаў, што патрабаванні Указа аб дзяржпадтрымцы павінны выконвацца клубамі бездакорна.

Далей Генадзь Нявыглас звярнуўся да праблем дзіцяча-юнацкага футбола. Ён паведаміў, што сёлета зроблена «каласальна шмат». У прыватнасці, усе школы атрымалі самыя сучасныя метадычныя дапаможнікі, але чамусьці працягваюць вучыць па-старому. Далей старшыня федэрацыі прывёў прыклады, як імкнуцца рабіць грошы на дзецях: «У Віцебску стадыён імкнецца выбіць грошы з дзіцячай школы. Хоць у нас усё павінна быць прызначана для бясплатнага развіцця дзіцячага футбола».

Яшчэ адзін праблемны момант — будаўніцтва футбольных палёў. Генадзь Нявыглас расказаў пра няўдалую практыку супрацоўніцтва з САКам «Алімпійскі» ў сталіцы. «На сродкі федэрацыі было пабудавана поле САК «Алімпійскі». Прайшло два гады і падагрэў не працуе. Гэта сведчыць пра тое, што належнага догляду там няма. Мы планавалі пабудаваць там і другое поле, але цяпер рабіць гэтага не будзем. Поле будзе ўкладзена ў Барысаве». Акрамя таго, палі будуць пабудаваныя ў Бабруйску, Лідзе і Рудзенску. Застаецца спадзявацца, што намеры стануць рэальнасцю, і на старце наступнага сезона кубкавыя матчы пройдуць не на заснежаных «агародах».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Здароўе нацыі

# Хрустальная мара анколагаў — выяўляць рак на ранніх стадыях

**Гібель вядомых людзей ад злаякасных новаўтварэнняў нараджае ва ўсіх нас усплёск не толькі заканамерных адмоўных эмоцый, але і шэраг традыцыйных пытанняў. Бадай, кожны з нас, неспецыялістаў, мала ведае пра рак. Між тым, гэта якраз той выпадак, калі інфармаваны — значыць узброены. На «традыцыйныя» пытанні пра рак адказвае галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд ГЕДРЭВІЧ.**



***— Рак шыйкі маткі цяпер прамым чынам звязваюць з вірусам папіломы чалавека. Прычым толькі з некаторымі яго тыпамі. Што ж такога робяць гэтыя тыпы ў шыйцы маткі, што там узнікае злаякасны працэс?***

— Сапраўды, вядома звыш 100 тыпаў віруса папіломы чалавека. 30-40 тыпаў з іх паражаюць толькі палавыя органы. Шэраг тыпаў могуць інфіцыраваць скуру рук і ног, выклікаць там з'яўленне барадавак, але яны не распаўсюджваюцца на іншыя часткі цела. Ёсць некаторыя тыпы вірусаў, якія могуць выяўляцца і ў генітальнай вобласці, і ў ротавай поласці, і ў гартані. Непасрэдна рак шыйкі маткі выклікаюць вірусы 16-га, 18-га, 31-га і 33-га тыпаў.

Шыйка маткі пакрытая эпітэліем. Пранікаючы ў эпітэліяльныя клеткі, вірус змяняе іх уласцівасці за кошт укаранення віруснага антыгена, што прыводзіць да ўзнікнення дысплазіі рознай ступені. Цяжкая ступень дысплазіі з'яўляецца перадракавым захворваннем і пры адсутнасці лячэння прыводзіць да ўзнікнення раку. Да пераданкалогіі адносіцца таксама шэраг іншых хранічных вірусных інфекцый, у тым ліку герпесных, цытамегаловірусных і іншых.

***— Што рабіць жанчынам, інфіцыраваным вірусам папіломы?***

— Галоўнае — не панікаваць, бо пакуль нічога страшнага не адбылося. Сам факт выяўлення віруса папіломы чалавека не азначае, што разаўецца передрак ці рак шыйкі маткі. Вельмі многія жанчыны ва ўзросце да 30 гадоў маюць у шыйцы маткі злаякасныя тыпы віруса папіломы чалавека. Пасля 30 гадоў, дарэчы, папіломавірусная інфекцыя сустракаецца радзей. Абсалютная большасць інфіцыраваных вірусам папіломы жанчын не маюць ніякіх праблем. У 95—99 жанчын з сотні вірус не выклікае ніякага захворвання. Праблемы могуць узнікнуць толькі ў 1—5 працэнтаў інфіцыраваных. Пры гэтым у частцы пацыентак узнікаюць захворванні, абумоўленыя дабраякаснымі формамі віруса: гэта кандыломы або папіломы палавых органаў, якія ў 100 працэнтах выпадкаў вылечваюцца.

***— Сцвярджаецца, што мець дачыненне да раку могуць і спробы амаладжэння з дапамогай ствалавых клетак. Што вы думаеце пра гэта?***

— Я не з'яўляюся спецыялістам у галіне клетачнай трансплантацыі. Аднак навуковыя даследаванні, якія праводзяцца спецыялістамі ў розных краінах, сведчаць, што ствалавыя клеткі ў некаторых сваіх варыянтах падобныя на ракавыя. І адны, і другія могуць неабмежавана дзяліцца, таму іх увядзенне ў арганізм правакуе развіццё імуннага адказу. Падобны прынцып актывацыі імуннай сістэмы выкарыстоўваецца пры распрацоўцы вакцын. Стварэнне вакцын супраць розных формаў раку — адна з найважнейшых задач малекулярнай біялогіі.

***— Ці можна ў цэлым любыя спробы амаладжэння клеткі лічыць рызыкоўнымі ў сэнсе магчымага злаякаснага перараджэння апошніх?***

— Не бяруся сцвярджаць гэта са 100-працэнтнай дакладнасцю, аднак ва ўмовах эксперыменту аказалася, што атрыманыя са звычайных клетак шляхам перапраграмавання ствалавыя клеткі маюць такую загану, як павышаная рызыка развіцця раку ў рэцыпіента — таго, каму перасаджваюць тканку ці орган. На бягучы момант вядуцца даследаванні па іх «абясшкоджванні».

***— Якія фактары ўзнікнення раку з'яўляюцца даказанымі? Ці азначае наяўнасць іх усіх у асобна ўзятага чалавека абавязковае развіццё раку?***

— Фактары, якія ўплываюць на працэс узнікнення раку, вельмі разнастайныя. Гэта фактар харчавання, шкодныя звычкі, інфекцыйна-біялагічныя фактары, фактары знешняга асяроддзя, прафесійныя, хімічныя, фізічныя, генетычныя, псіхасаматычныя. На канкрэтнага чалавека не могуць уздзейнічаць усе фактары адначасова, але 4-5 з іх, якія ўздзейнічаюць адначасова і на працягу значнага адрэзка часу, здольныя прывесці да передраку ці раку.

Да передракавых станаў адносяцца захворванні, якія характарызуюцца развіццём працэсаў з павышанай рызыкай перараджэння ў пухліну: атрафія — завяданне — парушэнне функцыі таго ці іншага органа, дыстрафія — расстройства харчавання тканак, праліферацыя — разрастанне тканкі органа шляхам утварэння атыповых клетак. Утварэнне раку ў людзей, якія маюць передпухлінныя захворванні, магчымае, але зусім не абавязковае. Як пераканаліся анколагі, кожны рак мае свой передрак, але далёка не кожны передрак пераходзіць у рак.

***— Многім дагэтуль здаецца, што рак узнікае раптоўна. Ці бывае злаякасны працэс раптоўным?***

— Злаякасная пухліна ніколі не ўзнікае раптоўна. Як правіла, да моманту выяўлення праходзіць некалькі гадоў, а ў некаторых выпадках і звыш дзесяці. Па прычыне біялагічных асаблівасцяў пухліна ў арганізме развіваецца аўтаномна, аднак на хуткасць дзялення пухлінных клетак канкрэтны арганізм адказвае па-рознаму — тармозіць або стымулюе. Важнае значэнне мае стан гарманальнага фону, пол і ўзрост пацыента. У маладых абсалютная большасць пухлін працякае больш агрэсіўна, чым у старых. Ва ўзнікненні раку фонавыя і передракавыя захворванні іграюць важную ролю. Вылучаюць факультатыўныя і аблігатныя передракі. Частата злаякаснага перараджэння факультатыўных передракаў складае 5-6 працэнтаў, аблігатных — звыш 60 працэнтаў, а асобных формаў — 100 працэнтаў. Саркомы могуць развівацца і ў наогул не зменена тканцы. Правакуючым фактарам можа паслужыць, напрыклад, траўма.

***— Што павінен рабіць чалавек, каб, па-першае, не захварэць, а, па-другое, не ўпусціць шанц выявіць хваробу як мага раней? Што перашкаджае беларусам знізіць колькасць выпадкаў раку ў 4-й, безнадзейнай, стадыі?***

— Па-першае, неабходна весці здаровы лад жыцця. Кінуць курыць, не злоўжываць алкаголем, півам, вострай, гарачай, вэнджанай і смажанай на вуглях ежай. Не захапляцца фастфудам і не падвяргаць сябе галаданню. Своечасова адпачываць і лячыць хранічныя захворванні, паколькі рана ці позна яны могуць прывесці да пухліны.

Па-другое, кожны чалавек, нягледзячы на сваю выключнасць і непаўторнасць, павінен памятаць, што ён з'яўляецца толькі маленькай часткай фаўны, таму падвержаны розным шкодным фактарам асяроддзя і мае абсалютна роўныя з усімі людзьмі шансы захварэць. Нашы пацыенты часта здзіўляюцца, маўляў, як жа так, я ж ніколі не хварэў! А значыць, і не думаў пра такую магчымасць. Быць упэўненым у тым, што ніколі не захварэеш, — значыць праяўляць бяспечнасць у адносінах да сябе. Яркім прыкладам з'яўляюцца ўрачы, якія кураць.

Актыўнае выяўленне хворых з раннімі стадыямі раку сёння з'яўляецца асноўным накірункам прафілактычнай работы ў анкалогіі. З пункту гледжання прафілактыкі раку вельмі важна своечасова выяўляць і рацыянальна лячыць захворванні, якія называюцца передпухліннымі. Асабліва важнымі з'яўляюцца прафілактычныя агляды так званага неарганізаванага насельніцтва — людзей пажылога і сталага ўзросту, якія не працуюць. Менавіта ў гэтым узросце часцей узнікаюць злаякасныя пухліны. Абследаванне працаздольнага насельніцтва павінна праводзіцца штогод па ініцыятыве наймальніка. Рызыка ўзнікнення хваробы існуе ў любым узросце. Каб не аказацца ў 4-й стадыі хваробы, варта паклапаціцца пра сябе самому. Выраз «ратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў» падыходзіць да сітуацыі як нельга лепш.

***— Наколькі дакладнай сёння з'яўляецца дыягностыка ўсіх відаў раку?***

— Гісталагічны метад даследавання паражонай тканкі часцей за ўсё з'яўляецца апошнім штрыхом у пастаноўцы анкалагічнага дыягназу і фактычна яго 100-працэнтнай гарантыяй. У асобных выпадках для ўдакладнення разнавіднасці злаякаснага працэсу выкарыстоўваецца імунагістахімічны метад. Дакладнасць дыягностыкі залежыць ад лакалізацыі пухліны. Існуюць цяжкадаступныя пухліны, напрыклад, у галаўным мозгу, а таксама новаўтварэнні, якія размяшчаюцца ў небяспечных анатамічных зонах, скажам, у галіне сэрца і буйных сасудаў, калі выкананне біяпсіі — забору матэрыялу для даследавання — уяўляе высокую рызыку. У гэтых выпадках дыягназ ставіцца на падставе іншых метадаў даследавання, у тым ліку, кансіліумам урачоў.

***— Ці ведаеце вы выпадкі, калі вылечыць рак дапамагла не класічная медыцына, а народныя метады, напрыклад?***

— Такіх выпадкаў у маёй клінічнай практыцы не было. Усе выпадкі «цудоўнага выздараўлення» пры дасканалым расследаванні або не мелі гісталагічнага пацвярджэння наяўнасці злаякаснай пухліны, або пры ўстанаўленні дыягназу была дапушчаная памылка. Нярэдкія выпадкі, калі пасля праведзенага камбінаванага лячэння пацыент прымаў нейкі сродак і выздараўеў. Заслуга афіцыйнай медыцыны апускаецца і ўсхваляецца толькі біялагічна актыўная дабаўка ці іншы сродак, які нібыта і прывёў да выздараўлення. Сумныя гісторыі вядомых людзей, якія загінулі ад злаякасных пухлін, наглядна сведчаць, што ні «цудадзейныя сродкі», ні замежныя спецыялісты не здольныя справіцца з запушчанымі выпадкамі хваробы.

***— Наколькі высокая верагоднасць пазбегнуць спадчыннага раку? Як паводзіць сябе таму, чые блізкія сваякі перанеслі рак ці загінулі ад яго?***

— Спадчынныя ракі — невялікая частка анкалагічнай захваральнасці. Усяго 1—5 працэнтаў. Неспрыяльныя прыкметы — фенатып — могуць сустракацца больш як у 30 працэнтаў насельніцтва, аднак рызыка развіцця злаякаснай пухліны аднесна невялікая. Напрыклад, спадчынны непаліпозны рак складае да 10 працэнтаў сярод усіх ракаў тоўстай кішкі і можа суправаджацца развіццём пухлін іншых лакалізацый. 7 працэнтаў жанчын, хворых на рак малочнай залозы, захварэлі таму, што ў іх ёсць мутацыя ў адпаведным гене. Асобы з сем'яў, у якіх былі дыягнаставаны два і болей выпадкаў злаякасных пухлін сярод крэўных сваякоў, якія маюць высокую рызыку развіцця раку, абумоўленага спадчыннымі фактарамі, павінны падвяргацца генетычнаму кансультаванню і дыягностыцы спадчынных сіндромаў з наступным іх лячэннем.

***— Калі б усе віды раку дыягнаставаліся на 1 і 2 стадыях, рак можна было б лічыць пераможаным? І калі б так, то што тады стала б другой прычынай гібелі насельніцтва пасля сардэчна-сасудзістых захворванняў?***

— Нягледзячы на тое, што рак пэўных лакалізацый досыць добра вывучаны, гаварыць пра перамогу над ім заўчасна, паколькі з «чумы ХХ стагоддзя» ён плаўна перайшоў у «чуму XXI стагоддзя». Небяспечна не сама хвароба, а яе зыход. А зыход залежыць ад стадыі, на якой пачата лячэнне. Калі б ажыццявілася хрустальная мара ўсіх анколагаў і ўсе злаякасныя пухліны дыягнаставаліся ў 1-2 стадыях, то вылечыць удалося б звыш 90 працэнтаў пацыентаў. А на другое месца перамясціліся б выпадкі гібелі ад няшчасных выпадкаў, траўмаў, атручэнняў і г.д.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Доктар адкажа

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**У найбліжэйшыя дні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**24 сакавіка** — галоўны ўрач Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Андрэй Пятровіч МІЦЬКО.

**25 сакавіка** — начальнік аддзела медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег Раманавіч ПАНЧУК.

**26 сакавіка** — галоўны ўрач Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны Інэса Браніславаўна МАСЛА.

**на «гарачай» лініі ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (222 20 25)**

**24 сакавіка** — загадчык неўралагічнага аддзялення № 1 Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Белабосаў В.І.

**25 сакавіка** — галоўны ўрач Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Зародава А.У.

**26 сакавіка** — загадчык дыспансэрнага аддзялення Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Заяц А.П.

*У графіку магчымыя змены.*

## Міліцыянеры сталі выратавальнікамі

Супрацоўнікі Першамайскага аддзела Віцебска Дэпартамента аховы міліцыянер — кінолаг Алег Баталка і міліцыянер — вадзіцель Сяргей Рулёў падчас дзяжурства выратавалі з палаючага дома мужчыну.

Як паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО**, уначы яны ехалі па вуліцы 4-й Індустрыяльнай у Віцебску і ўбачылі, што гарыць жылы дом у прыватным сектары. Хутка ацанілі становішча, выклікалі пажарных.

Сяргей кінуўся падымаць суседзяў, каб папярэдзіць людзей пра небяспеку, бо моцны вецер мог перанесці агонь на суседнія дамы. Алег спрабаваў папярэдзіць людзей з той паловы дома, якая гарэла. Усярэдзіне запалілі святло, але ніхто не выйшаў на ганак. Алег, адчыніў дзверы, якія, аказваецца, не былі зачыненыя. Убачыў мужчыну, які сядзеў на ложку. Як высветлілася, гэта — гаспадар. У яго ад стрэсу адмовілі ногі. Алег і Сяргей выцягнулі мужчыну на вуліцу. Ён расказаў, што ў другой палове дома знаходзіцца ягоны малодшы брат. Увечары той выпіваў, пастаянна курыў. На жаль, самастойна міліцыянеры не здолелі дапамагчы брату з-за моцнага агню. Зайшлі ў дом ўжо поўнасцю экіпіраваныя пажарныя. На ложку знайшлі труп брата выратаванага чалавека. Прычына пажару і гібелі малодшага з братоў — неасцярога пры курэнні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Тарасаў пайшоў. Тарасаў застаўся



На 70-м годзе жыцця памёр знакаміты беларускі пісьменнік, гісторык і публіцыст Кастусь Тарасаў. Яго цела было знойдзена ў кватэры, якую ён здымаў, праз тры дні пасля наступлення смерці. Кажуць, ён памёр за працоўным сталом, падчас работы. Людзі, якія ведалі пісьменніка асабіста, адзначаюць, што гэта быў вельмі працавіты, сумленны і надзвычай сціплы чалавек. Некалькі гадоў таму ён перанёс інсульт, але жыў адзін, не хацеў нікога абцяжарваць, збольшага здолеў пераадолець наступствы хваробы, працягваў пісаць і шмат яшчэ паспеў зрабіць.

— Спадар Тарасаў займае ў нашай літаратуры і публіцыстыцы прыкладна такое ж месца, як і Уладзімір Караткевіч, — лічыць старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў. — Ён пачынаў як рускамоўны пісьменнік, напісаў шэраг цікавых дэтэктываў і гістарычных аповесцяў на рускай мове, потым перайшоў на беларускую. Яго публікацыі вызначаюцца сваёй гістарычнасцю. Сам я вельмі люблю перачытваць «Позняе каханне князя Міндоўга». Гэта ўнікальная рэч пра XIII стагоддзе, якая чытаецца на адным дыханні. А яго «Памяць пра легенды» паўплывала на пакаленні беларусаў у 70-я і 80-я гады. «Пагоня на Грунвальд» — таксама незвычайны і ўплывовы твор. (Рыхтуецца да перавыдання. — **Рэд.**) Пісаў ён да апошніх дзён. Браў актыўны ўдзел у ТБМ.

Апошні свой ліст Кастусь Тарасаў даслаў на сайт, з якім супрацоўнічаў, 19 сакавіка ў другой палове дня: «Сёння ў мяне не выходзіць перадаць файл. Перадам заўтра. К». Праз тры дні сястра пісьменніка забіла трывогу, бо не магла да яго дазваніцца. А 22 сакавіка, у дзень, калі яго знайшлі, у Таліне нарадзіўся ўнук Кастуся Тарасава.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## «Мінёраў» зафіксавала відэакамера

На пачатку тыдня ў Мінску ў адной з кавярняў давялося тэрмінова эвакуяваць наведвальнікаў: невядомыя паведамілі, што ў будынку закладзенае выбуховае прыстасаванне. Міліцыі не склала цяжкасцяў на гэты раз адшукаць «жартаўнікоў», бо на адным з будынкаў відэакамера зафіксавала свавольнікаў. Такім чынам бавілі час браты 8, 9 і 13 гадоў і іх 13-гадовы сябра. Між іншым, старэйшы з братоў разам з сябрамі «мініраваў» кавярню і раней. Тады па факце заведама несапраўднага паведамлення аб небяспецы была ўзбуджаная крымінальная справа. Цяпер крымінальная справа закрытая, а маці «мінёра-аматара» атрымае штраф.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ФРАНЦУЗЫ ВЫЙШЛІ НА АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНЫ СТРАЙК




**У Францыі праходзіць агульнанацыянальны страйк супраць эканамічных і сацыяльных рэформаў прэзідэнта Нікаля Сарказі. Як паведамляе BBC News, страйк пагражае паралічом чыгуначнага транспарту.**

На працу ў аўторак не выйшлі тысячы чалавек. Усе яны пратэстуюць супраць планаў рэформы пенсійнага абслугоўвання, масавых скарачэнняў у бюджэтнай сферы і зніжэння пакупной здольнасці насельніцтва.

Найбольш актыўны ўдзел у страйку прымаюць прафсаюзы настаўнікаў, працаўнікоў транспарту і дзяржаўных устаноў.

### У ЛАТВІІ З'ЯВІЎСЯ НОВЫ СЛОГАН



**Рэкламнае агенцтва Adell Saatchi&Saatchi па замове Дзяржаўнага агенцтва развіцця турызму (TAVA) прыдумала для Латвіі новы слоган: Best enjoyed slowly («Лепш атрымліваць асалоду павольна»). Пра гэта піша інфармацыйны партал Латвіі Delfi. Стварэнне новага слогана абышлося агенцтву ў 10 тыс. латаў (14 тысяч еўра).**

Новы слоган з'явіўся ў рамках рэкламнай кампаніі, якая прасоўвае латвійскі рэгіянальны турызм. «Лепш атрымліваць асалоду павольна» закліканы павялічыць плынь турыстаў, якія аддаюць перавагу спакойнаму адпачынку ў сельскай мясцовасці, рыбалцы і шпацырам па запаведных зонах.



## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПРЕДПРИЯТИЯ, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ПРОЦЕДУРЕ БАНКРОТСТВА С ЛИКВИДАЦИЕЙ

**(цены снижены на 65 %)**

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 «А». Объект продается одним лотом.<br>- ремонтные мастерские и административно-бытовой корпус общей площадью **592,4 кв. м**, год постройки ремонтных мастерских 1994; административно-бытового корпуса 2007 г.<br>- ограждение железобетонное (плиты размером 4х2 м в кол-ве 18 шт. основные средства и оборотные активы согласно перечня, **начальная цена объекта** 535 000 000 (Пятьсот тридцать пять миллионов) рублей, в т.ч. НДС 89 000 000 (Восемьдесят девять миллионов) рублей.<br>Решение об отводе земельного участка, пл. 0,2780 га, имеется. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества оговорен в условиях проведения аукциона.<br>Оплата за объект производится в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Задаток 5 % от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012203400038 в отделении ОАО «Белагропромбанк» в г. Молодечно код 914, УНП 600077843, ОКПО 05414829, получатель: СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй». Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 164 от 02.09.09 г. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **06.04.2010 г.** до 16.00, г. Вилейка, ул. Горького, д. 7, кв. 8, управляющий СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй», тел.: (8 01771), 5 36 77 (факс), МТС 8 029 578 36 77; vel 8 029 685 36 77. |
| **Дата, время и место аукциона** | **07.04.2010 г.** в 12.00, г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 «А». |
| | Аукцион состоится при наличии не менее двух участников на один лот. |

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЕМ по продаже земельного участка гражданам Республики Беларусь в частную собственность:

НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА.

■ для строительства и обслуживания жилого дома, расположенного по адресу: Минская область, Вилейский район, Вязынский с/с, д. Вязынь площадью 0,1578 га (кадастровый номер 621381302101000282) с начальной ценой 137 191 рубль. Расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией, подлежат возмещению победителем аукциона в сумме 460 150 рублей. Шаг аукциона установлен в размере 15 % от предыдущей цены.

ПРОДАВЕЦ – Вязынский сельский исполнительный комитет.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА – 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ – платеж в размере цены земельного участка за вычетом суммы задатка на р/с № 3600613010015 в филиале 632 АСБ «Беларусбанк», г. Вилейка, код 260, получатель платежа: ГУ Минфина РБ Вязынский сельисполком; код платежа 04901, УНП 600015824, согласно протокола аукциона, в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. Возмещение расходов, связанных с формированием земельного участка и его государственной регистрацией, перечислять также на указанный счет с кодом платежа 04616.

■ для строительства и обслуживания жилого дома, расположенного по адресу: Минская область, Вилейский район, Костеневичский с/с, д. Сосенка площадью 0,1665 га (кадастровый номер 621383416601000147) с начальной ценой 555 844 рубля. Расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией, подлежат возмещению победителем аукциона в сумме 487 130 рублей. Шаг аукциона установлен в размере 15 % от предыдущей цены.

ПРОДАВЕЦ – Костеневичский сельский исполнительный комитет.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА – 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ – платеж в размере цены земельного участка за вычетом суммы задатка на р/с № 3600613060065 в филиале 632 АСБ «Беларусбанк» г. Вилейка, код 260, получатель платежа: ГУ Минфина РБ Костеневичский сельисполком; код платежа 04901; УНП 600015893, согласно протокола аукциона, в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. Возмещение расходов, связанных с формированием земельного участка и его государственной регистрацией, перечислять также на указанный счет с кодом платежа 04616.

СУММА КОМПЕНСАЦИИ ЗАТРАТ НА ОРГАНИЗАЦИЮ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНА: согласно протокола аукциона, в течение 5-ти рабочих дней на р/счет СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ДОКУМЕНТЫ, ПРЕДОСТАВЛЯЕМЫЕ ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ – заявление на участие, заверенная банком копия платежного документа на внесение задатка; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и его копию.

КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ – 26.04.2010 г. до 16.00.

АДРЕС, ПО КОТОРОМУ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВЛЕНИЯ – г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к.1

ДАТА, ВРЕМЯ, МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА – 27.04.2010 г. в 14.00 по адресу: г. Вилейка, ул. Партизанская, д. 44, СИКУП, зал заседаний Вилейского районного Совета депутатов.

Аукцион состоится при наличии одного участника на один лот.

**Тел. для справок: 8 (01773) 5 16 09, 8 (044) 710 74 60.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЕМ по продаже права заключения договора аренды земельного участка:

НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА.

■ для размещения торгового павильона и административного помещения, расположенного по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Я. Красина, 27, площадью 0,1975 га (кадастровый номер 621350100007002136) с начальной ценой 4 340 050 рублей; расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией в сумме 651 925 рублей подлежат возмещению победителем аукциона. Потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, подлежат возмещению в сумме 4 438 090 рублей. Срок аренды земельного участка – 25 лет. Шаг аукциона установлен в размере 10 % от предыдущей цены.

■ для размещения торгового павильона, расположенного по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Волынца, площадью 0,0020 га, кадастровый номер 621350100000000599 с начальной ценой 22 690 рублей; расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией в сумме 632 495 рублей подлежат возмещению победителем аукциона. Срок аренды земельного участка – 5 лет. Шаг аукциона установлен в размере 15 % от предыдущей цены. Земельный участок предоставляется победителю аукциона при условии оборудования им площадки с навесом на автобусном остановочном пункте, находящемся рядом с данным земельным участком.

Продавец – Вилейский районный исполнительный комитет.

Организатор аукциона – СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА – 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ – платеж в размере цены на право заключения договора аренды за вычетом суммы задатка на р/с Вилейского районного бюджета № 3602613000342 код платежа 04002 в филиале 632 АСБ «Беларусбанк», г. Вилейка, код 260, УНП 600011089, согласно протокола аукциона, в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. Возмещение расходов, связанных с формированием земельных участков и их государственной регистрацией перечислять также на указанный счет с кодом платежа 04616.

ВОЗМЕЩЕНИЕ ПОТЕРЬ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА перечислять на счет Управления государственного казначейства по Минской области № 3602916040009, код платежа 05201 в филиале 632 АСБ «Беларусбанк», г. Вилейка, код 260, УНП 600003250.

СУММА КОМПЕНСАЦИИ ЗАТРАТ НА ОРГАНИЗАЦИЮ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНА: согласно протокола аукциона, в течение 5-ти рабочих дней на р/счет СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ДОКУМЕНТЫ, ПРЕДОСТАВЛЯЕМЫЕ ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ – заявление на участие, заверенная банком копия платежного поручения на внесение задатка; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии учредительных документов и свидетельства о регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и его копию.

КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ – 26.04.2010 г. до 16.00.

АДРЕС, ПО КОТОРОМУ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВЛЕНИЯ – г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к.1.

ДАТА, ВРЕМЯ, МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА – 27.04.2010 г. в 14.00 по адресу: г. Вилейка, ул. Партизанская, д. 44, зал заседаний Вилейского районного Совета депутатов.

Аукцион состоится при наличии одного участника на один лот.

**Тел. для справок: 8 (0176) 75 16 09, 8 (044) 710 74 60.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, И НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится **6 апреля 2010 г. в 11.15** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

**Организатор аукциона:** фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 229022, 311185, 311216, 223375.

**Продавцы недвижимого имущества:** по лотам №№ 1, 2 – РУП «Могилевское отделение Белорусской железной дороги», 8(0222) 392665, 393719; по лотам №№ 3, 4, 5 – ПРУП «Могилевоблгаз», 8(0222) 450164.

Заявления с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **2 апреля 2010 г. до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона **6 апреля 2010 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о предметах аукциона: Информация о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена продажи недвижимого имущества, тыс. руб. | Информация о земельных участках: Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельных участков, тыс. руб. | Начальная цена продажи предмета аукциона, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (здание усилительного пункта связи)** одноэтажное кирпичное площадью 124,8 кв.м | Могилевская обл., Белыничский район, дер. Станция Друть | 18 259,235 | 0,0987 | 50 | 10,480 | 18 269,715 | 1 800,0 |
| 2 | **Капитальное строение** (гаражи со сторожкой) одноэтажное кирпичное 131,05 кв.м. | Могилевская область, Кричевский район, д. Ивановка | 5 921,337 | 0,0430 | 50 | 24,500 | 5 945,837 | 590,000 |
| 3 | **Капитальное строение**: **одноэтажное здание магазина**, фундамент бетонный, стены кирпичные со складом общей площадью 214,7 кв.м | Могилевская область, Кличевский район, Гончанский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская, 6 | 99 002,679 | 0,0347 | 10 | 3,048 | 99 005,727 | 9 900,0 |
| 4 | **Капитальные строения: здание магазина**, фундамент кирпичный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 219,3 кв.м; здание **заводоуправления**, фундамент кирпичный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 205,5 кв.м, мощение (ж/б плитка) площадью 24 кв.м | Могилевская область, Глусский район, Кировский сельсовет, п. Кировское | 142 732,077 | 0,0518 | 10 | 2,140 | 142 735,987 | 14 000,0 |
| | | | | 0,0429 | 10 | 1,770 | | |
| 5 | **Капитальные строения: здание конторы двухэтажное**, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 504,7 кв.м; **пожарное депо**, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 306,0 кв.м; **механическая мастерская**, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 605,0 кв.м; **автогараж**, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 544,0 кв.м; **продовольственный склад,** фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 257,0 кв.м; **здание цеха,** фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша рулонная, железная, общей площадью 355,1 кв.м; **здание цеха № 2,** фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 145,9 кв.м; **здание цеха № 3,** фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, общей площадью 453,5 кв.м; **столовая-магазин,** фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша металлическая, общей площадью 367,7 кв.м; **асфальтовое** покрытие площадью 374 кв.м. | Могилевская область, Бобруйский район, п. Редкий Рог | 580 504,235 | 0,0458 | 15 | 10,36 | 580 659,705 | 58 000,0 |
| | | | | 0,0711 | | 16,083 | | |
| | | | | 0,1315 | | 29,745 | | |
| | | | | 0,1014 | | 22,936 | | |
| | | | | 0,0499 | | 12,416 | | |
| | | | | 0,0232 | | 5,248 | | |
| | | | | 0,0716 | | 16,196 | | |
| | | | | 0,1366 | | 42,486 | | |

Начальная цена недвижимого имущества, входящего в состав лотов №№ 1 и 2, понижена на 20 процентов.

**Условия для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договора аренды которых входит в состав лотов:**

**- № 1:** в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенных на аукционе зданий и сооружений);

**- № 2:** в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Кричевского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года;

**- № 5:** получение победителями аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Задатки перечисляются на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Полная информация о недвижимом имуществе, условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 12 февраля 2010 г.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Срок подписания договора купли-продажи и договора аренды земельного участка не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона и формирование земельного участка, а также средства, затраченные организацией по землеустройству на осуществление государственной регистрации изменения земельного участка, из которого изымается часть, или прекращения существования изъятого земельного участка.

